УДК 346.26 (476)

# ПРАБЛЕМЫ МАЛОГА БІЗНЕСУ НА ПАЧАТКУ ЯГО СТАНАЎЛЕННЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

**Таранда М.І.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У краінах ЕС, такіх як Германія, Італія, Францыя, малыя і сярэднія прадпрыемствы фарміруюць не менш 50% ВУП. У Беларусі ўнёсак малога і сярэдняга бізнесу ў ВУП складае, паводле даных

Мінэканомікі, 15,7%. Большая частка суб'ектаў прадпрымальніцтва сканцэнтравана ў сферы абслугоўвання – 42%[1].

Малое прадпрымальніцтва ў былым СССР атрымала развіццё ў лістападзе 1989 года, калі быў утвораны Саюз малых дзяржаўных прадпрыемстваў. А ўжо 8 жніўня 1990 года Савет Міністраў СССР прыняў пастанову № 790 "Аб мерах па стварэнні і развіцці малых прадпрыемстваў", у якой рэгламентаваліся заснавальнікі, колькасны склад працаўнікоў, статутныя дакументы і ўмовы рэгістрацыі [2].

МП «Альба Р" у адпаведнасці з "Пастановай" пад № 433 было зарэгістравана 16.10.1991 г. выканаўчым камітэтам Гродзенскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, а 31.10.1991 упраўленне Гроднааблстат прысвоіла МП усе неабходныя коды. У Статуце прадпрыемства былі заяўлены некалькі відаў дзейнасці: грамадскае харчаванне, вытворчасць, перапрацоўка і рэалізацыя сельгаспрадукцыі, турызм, знешнеэканамічная дзейнасць і іншыя. У большай ці меншай ступені пералічаныя віды дзейнасці МП выкарыстоўваліся. Але, у асноўным дзейнасць прадпрыемства было прадстаўлена кавярняй пад назвай "Батлейка", якая адчынілася ў красавіку 1992 г. ў будынку абласнога тэатра лялек. Галоўным у дзейнасці кавярні было падтрыманне беларускіх традыцый не столькі ў асартыменце меню, як ў беларускім афармленні, надпісах, музыцы. Таму вельмі хутка "Батлейка" стала любімым месцам адпачынку інтэлігенцыі, творчых асобаў, музыкантаў, пісьменнікаў і ўвогуле гасцей г.Гродна. Гэта было адзінае месца ў Гродне, дзе можна было замовіць каву па-ірландску. Падчас дзіцячых пастановак у меню быў прадстаўлены дзіцячы асартымент.

Афармленне дакументацыі працягвалася і пасля адкрыцця кавярні. 16.09.1992 г. выканкам гарсавета дазваляе адчыніць кафэ і ад 20.01.1993 года выдае ліцэнзію № 473 на рознічны гандаль. Больш чым праз год працы, у жніўні 1993 г., было атрымана заключэнне аб адкрыцці кафэ МП "Альба Р" з усталяваным асартыментам ад ГГЦГіЭ, якое падпісаў галоўны дзяржаўны санітарны ўрач г.Гродна. 20.03.1997 г. была падпісана дамова з Гродзенскім трэстам сталовых і рэстаранаў Ленінскага раёна на падставе рашэння гарвыканкама № 485 ад 26.09.1995 г. "Аб якасці рэалізуемых прадуктовых тавараў" наконт аказання паслуг спецыяльнай лабараторыяй, якая правярае якасць прадуктаў. МП "Альба Р" ад першага дня мела свайго бухгалтара.

Малыя прадпрыемствы хоць тады і адчыняліся, але прадукты па безнаяўнасці набыць было амаль немагчыма. Толькі нейкі час 2-гі Гродзенскі мясакамбінат адпускаў для кавярні каўбасныя вырабы. Закупы прадуктаў вяліся за наяўны кошт. Дзеля гэтага банк выдаў МП

дазвол на выкарыстанне наяўных сродкаў ў памеры 75% выручкі. Але ў 1994 годзе выйшаў указ аб забароне карыстання наяўнымі грашовымі сродкамі. Ужо некалькі месяцаў ішла праверка дзейнасці кавярні адміністрацыяй, і Указ Прэзідэнта правяраючым аказаўся на руку, штрафныя санкцыі вылiлiся ў фантастычную суму. Калі немагчыма закупіць прадукты за безнаяўныя, за наяўныя таксама, тады астаткі тавару кавярні набліжаюцца да 0. Адзінае выйсце – не рэгістраваць закупы. Тым больш, што прыватныя магазіны не выдаюць чэкі, так як і ў іх тавар "левы". Праблемным быў і працэс здачы грошай ў банк, які на падставе выручкі за папярэднія 3 месяцы даваў дазвол на астаткі касы. Кавярня працавала да 23 гадзін і калі атрымлівала большую выручку, чым дазвалялася, пры чарговай праверцы – зноў штрафныя санкцыі за тое, што выручка засталася ў касе на наступны дзень. Бюджэт павінен быў папаўняцца, і правяраючыя хадзілі адзін за адным – цэнтры гігіены, падаткавыя, АБЭП, падаткавая паліцыя, энергетыкі, пажарнікі і прадстаўнікі іншых арганізацый. Пасля адной з праверак падаткавай давялося выплаціць у двухразовым памеры кошт тавару, які значыўся ў накладных.

90-я гг. – гэта час стварэння бандфарміраванняў, якія дзейнічалі адначасова з дзяржаўнымі структурамі не на карысць малых прадпрыемстваў. Кавярня "Батлейка" наўпрост не плаціла ніякім бандытам і была ў гэтым сэнсе выключэннем з правіл. Але крэдытаванне іх на нейкі час за кошт рэалізуемай прадукцыі ускладняла фінансавую сітуацыю. Выжыць дапамагаў дадатковы гандаль з Расіяй сельгаспрадукцыяй (масла, сыр). Прадпрыемства пратрымалася да канца 1998 года, фінансава акрэпла і было зачынена за кошт спынення арэнды памяшкання яго ўладальнікам.

### ЛІТАРАТУРА

1. Мінэканомікі канстатуе невысокі ўнёсак малога бізнесу ў эканоміку краіны. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://nn.by/?c=ar&i=122174. Дата доступу:06.02.2014.

2. Постановление Совета Министров СССР от 8 августа 1990 г. № 790 «О мерах по созданию и развитию малых предприятий» // СП СССР. -1990 г. № 19.-С. 101.